**Мархоцкі Я.Л.**, *прафесар*
**Якутовіч Т.Н.**, *ст. выкладчык*

# УПЛЫЎ УЗРОЎНЮ ВЕДАЎ І АГУЛЬНАЙ КУЛЬТУРЫ СТУДЭНТАЎ НА ПРАФІЛАКТЫКУ СНІДу

Праблема СНІДу не толькі медыцынская, гэта праблема ўсяго грамадства. Штодзённа ў свеце выяўляецца больш за 5000 новых носьбітаў віруса СНІДу. Не мінуў ён і нашу рэспубліку, і па прагнозах вучоных да канца XX веку кожны чацвёрты жыхар свету можа быць інфіцыраваны вірусам СНІДу.

Панацэі ад «чумы XX веку» сёння няма, таму галоўным сродкам прафілактыкі СНІДу можа быць толькі асвета насельніцтва. Ва ўмовах адсутнасці вакцыны і сродкаў лячэння важнае значэнне набываюць інфармацыйныя і асветніцкія праграмы, а таксама паглыбленне санітарна-прафілактычнай работы сярод насельніцтва. У сувязі з гэтым дзеячы культуры і мастацтва павінны данесці да кожнага чалавека, што мы стаім на парозе вялікай трагедыі, што павінны весці здаровы лад жыцця, прымаць неадкладныя меры прафілактыкі з улікам вопыту іншых краін свету.

З мэтай выканання пастановы Міністэрства адукацыі і навукі РБ за N 112 ад 20 кастрычніка 1995 года «Аб правядзенні ў ВНУ заняткаў па праблеме СНІДу» намі вывучаўся першапачатковы ўзровень ведаў студэнтаў аб ВІЧ-інфекцыі і СНІДу. Гэта дазволіць палепшыць падрыхтоўку студэнтаў па праблеме СНІДу, акрэсліць колькасць вучэбных гадзін, неабходнасць гэтага курса і вызначыць тэматыку вучэбнай праграмы, а таксама высветліць агульны ўзровень культуры студэнтаў у дадзеным напрамку.

У гэтай сувязі намі была распрацавана ананімная анкета, якая ўключала шматлікія пытанні этыялогіі, патагенезу, клінікі, узроўню рызыкі заражэння і бяспекі сексу, лячэння, прагнозу і прафілактыкі СНІДу. Прaанкетавана 392 студэнты Беларускага універсітэта культуры і Беларускага дзяржаўнага універсітэта.

Вынікі даследаванняў паказалі нізкі ўзровень ведаў студэнтаў аб этыялогіі і патагенезе СНІДу. На пытанне, што такое СНІД і што выклікае яго, правільна адказалі 84,0% юнакоў і 88,5% дзяўчат. Але на пытанне, ці ўсе ВІЧ-інфіцыраваныя захворваюць СНІДам, станоўчы адказ быў толькі ў 34,4% юнакоў і ў 30,7% дзяўчат. А на пытанне, праз які час з моманту заражэння можна ўстанавіць, што чалавек заражаны вірусам, правільны адказ быў усяго ў 28,5% юнакоў і 45,1% дзяўчат. На пытанне, ці могуць ВІЧ-інфіцыраваныя (але не хворыя) людзі распаўсюджваць хваробу, заражаць другіх, толькі 42,0% юнакоў і 40,0% дзяўчат адказалі правільна.

Звыш 90% студэнтаў не ведаюць, у якіх біялагічных асяроддзях чалавека знаходзіцца ўзбуджальнік СНІДу і якія органы і тканкі паражаюцца пры гэтым. На паражэнне клетак галаўнога мозгу ў ВІЧ-інфіцыраваных указалі толькі 5,9% юнакоў і 10,6% дзяўчат, а на паражэнне лімфацытаў указалі суадносна 10,8% і 26,7%. Каля 10% студэнтаў не ведаюць, што сярод жыхароў Рэспублікі Беларусь маюцца ВІЧ-інфіцыраваныя і хворыя СНІДам.

Такім чынам, узровень ведаў студэнтаў па пытаннях этыялогіі і патагенезу СНІДу параўнаўча нізкі. Як відаць, сродкі масавай інфармацыі не забяспечваюць моладзь дастатковымі ведамі аб гэтай хваробе, якая можа пазбавіць нацыю будучыні. У сувязі з гэтым пытанні СНІДу трэба грунтоўна вывучаць у навучальных установах.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ